Боевой товарищ Степан и прикованый к кровати Дед, пытаются понять, как же так могло случиться, что сегодняшние еще молодые люди, внуки тех, кто бесстрашно отдавал жизнь на войне ради мирного счастья выросли такими циничными и равнодушными. Откуда в них столько черствости и безразличия к одинокому старику, к друг другу.

Этот вопрос Дед задает себе, Степану и не находит на него ответа. Дед, выживший в этой смертельной битве, оказывается добрее, душевнее, морально чище тех, кто вырос под мирным небом над головой. И этот вопрос повисает в оглушительной тишине зрительного зала.

Зритель прощается с Дедом… Он уходит из жизни, после очередного семейного скандала, так и не дождавшись праздника Великой Победы.

Одиночество Деда … Одиночество Ветерана ...

Достоин ли Дед такого финала жизни?

Нет вам места, дорогие ветераны, в жизни ваших внуков, правнуков – говорит автор пьесы В. Панин и постановщик спектакля Д. Паршин.

Может быть сегодня так и надо разговаривать с современный зрителем? Не жалея его, заставляя протестовать против своей духовной нищеты и равнодушия?

Точный и смелый посыл театра не оставляет зрителю выбора нейтральной позиции. И для театра слова память, мораль, дань уважения к прошлому – это не пустой звук, не формальность, не фарс. В современном хаосе исторических разночтений зрителю настойчиво предлагают осознать значимость Великой Победы и тех, кто вынес на своих плечах все тяготы и лишения той страшной войны. Возможно попытка театра разобраться в моральных и этических проблемах сегодняшнего общества оказалась слишком эмоциональной, жесткой, дерзкой, “лобовой”. Но актуальность назревших проблем обозначена театром с бескомпромиссной прямотой.

Кровавый крест на братской могиле – символ памяти для тех, кто живет сегодня.

---

1. Официальный сайт Республиканского театра белорусской драматургии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// www.rtbd.by. – Дата доступа: 24.05.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АМАТАРСКАЕ ТЭАТРАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР’Я

**Алексніна І. А.**
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці*
*УО “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Сёння, у XXI стагоддзі, на першы план выступаюць духоўна-фарміруючая і мастацка-эстэтычная функцыі аматарскай тэатральнай творчасці. Як і раней, галоўнымі яе задачамі з’яўляюцца раскрыццё і развіццё творчых здольнасцей, фарміраванне станоўчых якасцей асобы, эстэтычнае выхаванне гледача, знаёмства са здабыткамі і каштоўнасцямі нацыянальнай і сусветнай

культуры. Малавывучанай сучасным тэатразнаўствам застаецца творчасць народа, у тым ліку, дзейнасць аматарскіх тэатраў Беларусі ў постсавецкі перыяд.

Першыя пасляваенныя гады можна назваць плёнnымі для фарміравання сістэмы шматжанравай мастацкай самадзейнай творчасці савецкага перыяду. Яна пацвердзіла сваю мастацка-эстэтычную значнасць і заняла пачэснае месца ў жыцці нашага грамадства. Пры гэтым, аб'яднанні аматараў сцэны складаюць амаль палову агульнай колькасці калектываў арганізаванай самадзейнасці. Аб гэтым сведчаць і статыстычныя данныя: у 1946 г. з 2884 мастацкіх гурткоў рэспублікі 1181 – драматычны. У наступным, 1947 г., агульная лічба павялічваецца да 3340, з якіх – 1544 тэатральныя. Да пачатку 1951 г. ў краіне працуе ўжо 6128 самадзейных аб'яднанняў, з якіх – 2319 драматычныя. Праз два гады толькі тэатральных – 2760 гурткоў. Колькаснае павялічэнне тэатральна-драматычных калектываў не спыняецца і ў 1970-я гг. Напрыклад, толькі ў пачатку 1972 г. зафіксавана 46 калектываў са званнем "народны тэатр" і каля 6000 драматычных гурткоў [1, с.233–293].

Нягледзячы на пашыранасць, пастаноўкі калектываў аматараў тэатра ў першыя гады характарызаваліся нізкім мастацкім ўзроўнем, што можна растлумачыць штучным навязваннем рэпертуару "на злобу дня", недахопам высокакваліфікаваных кіраўнікоў, небагатай матэрыяльнай базай.

Росту выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў народных тэатраў у II палове XX стагоддзя спрыялі не толькі выступленні на стацыянарных пляцоўках, шматлікія гастролі па райцэнтрах і вёсках, падтрымка дзяржаўных і мясцовых ўлад, узмацненне сувязяў дзеячаў прафесійнага мастацтва з калектывамі народнай творчасці. У розныя часы з беларускімі аматарамі сцэны супрацоўнічалі вядучыя майстры нацыянальнай прафесійнай сцэны: Е. Міровіч, К. Саннікаў, А. Кістаў, П. Малчанаў, Л. Літвінаў, У. Уладамірскі, У. Кавязін, М. Зораў, А. Ільінскі, В. Пола, Дз. Арлоў, В. Галіна, Ц. Сяргейчык, З. Стома, Ф. Шмакаў, М. Захарэвіч, Л. Давідовіч, С. Станюта і іншыя.

Вельмі значную ролю ў культурным і мастацкім жыцці Заходняга Паазер'я (да якога адносяцца пяць сучасных раёнаў Беларусі: Браслаўскі, Пастаўскі, Міёрскі, Докшыцкі, Глыбоцкі) ў савецкі і пост-савецкі перыяд, асабліва ў 1980-я гады XX стагоддзя, адыгравалі народныя тэатры. У ліку вядучых калектываў рэгіёна – Браслаўскі народны тэатр (1944 г.; званне ў 1961 г.), Пастаўскі народны тэатр (1950 г.; званне ў 1959 г.), Докшыцкі народны тэатр (1947 г.; званне ў 1982 г.), Міёрскі народны тэатр (1960 г.; званне 1986 г.).

Агульная колькасць найбольш значных пастановак, створаных аматарамі тэатральнага мастацтва Заходняга Паазер'я больш як за соракагадовы перыяд (да пачатаку 1990-х гг.), работ, якія атрымалі высокую ацэнку гледачоў і журы конкурсаў, аглядаў, дэкад і прафесіянальнай крытыкі, складае больш як 146 спектакляў. Пераважная большасць з іх – сцэнічныя версіі твораў рускіх класікаў, савецкіх аўтараў і драматургаў былога СССР (78 твораў). Даволі многа ставілася ў гэты час і нацыянальнай драматургіі, як класічнай, так і сучаснай (61 твор). Пастаноўкі замежнай драматургіі склала толькі каля 4,5%.

Сярод твораў рускіх класікаў, на падставе якіх ствараліся спектаклі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

папулярнасцю карысталіся А.П. Чэхаў (“Юбілей”, “Мядзведзь”, “Зламыснік”, “Прапанова”, якія былі пастаўлены ва ўсіх тэатрах рэгіёна); М.В. Гогаль (“Рэвізор”, “Жаніцьба”; Докшыцы і Браслаў); Д.І. Фанвізін (“Недаростак”; Міёры); І. Салагуб (“Бяда ад пяшчотнага сэрца”; Браслаў), А.М. Астроўскі (“Позняе каханне”, Паставы і Браслаў; “Беднасць не загана”, Паставы; “Без віны вінаватыя”, Докшыцы; “Не ўсё кату масленніца”, Браслаў; “Свае людзі – паладзім”, Докшыцы, Міёры). Найбольш папулярнымі былі менавіта творы А.М. Астроўскага. Яны складалі амаль палову паказаў паводле расійскай класікі.

Кожны народны тэатр мае адметныя творчыя рысы, мастацка-эстэтычныя здабыткі і традыцыі. Старэйшы тэатр рэгіёна – Браслаўскі, створаны А. Ламбертам 1944 г. Перыяд яго росквіту прыпадае на канец1940-х гг. – канец 1960-х гг. і звязаны з працай рэжысёра, былога прафесійнага акцёра Трэцяга беларускага тэатра, вучня У.І. Галубка Васіля Галкіна. У рэпертуары тэатра прыярытэт належыў рускамоўнай і беларуская драматургіі. З 45 шматактовых спектакляў, пастаўленых за 50 год, 46,6% паказаны на рускай мове. Прыкладна такую ж лічбу ў працэнтных адносінах складаюць і пастаноўкі паводле беларускай драматургіі. Астатнія 6,8 % – п‘есы замежных аўтараў. У жанравых адносінах найчасцей ставяцца п’есы камедыйнага плану, музычныя вадэвілі, скетчы, інтэрмедыі.

З нацыянальнай драматургіі ў рэжысуры В.П. Галкіна ставяцца “Прымакі”, “Паўлінка” Я. Купалы; “Хто смяецца апошнім” К. Крапівы; “Залёты”, “Пінская шляхта” В. Дуніна-Марцінкевіча; “Не верце цішыні” І. Шамякіна; “Выбачайце, калі ласка!”, “Лявоніха на арбіце”, “Таблетку пад язык”, “Трыбунал”, “Зацюканы апостал” А. Макаёнка; “Пайсці і не вярнуцца” паводле В. Быкава; “Мудрамер” М. Матукоўскага; “Купальская ноч”, “Радавыя” А. Дудурава; “Машэка” М. Арахоўскага і інш. У спектаклях было багата музыкі, песень, танцаў. Тэатр выкарыстоўваў пастановачны і арганізацыйны вопыт І.Ц. Буйніцкага і У.І. Галубка, славіўся паспяховымі гастролямі не толькі па Беларусі, але і ў Латвію і Літву.

Творчая дзейнасць В.П. Галкіна аказала значны ўплыў  на пашырэнне сеткі арганізаванай тэатральнай самадзейнасці, павышэнне якаснасці акцёрскіх рабо, забеспячэнні драмгурткоў рэпертуарам і стварэнне Пастаўскага народнага тэатра (1950 г.). Яго рэпертуар будуецца на творах рускіх аўтараў і пісьменнікаў бліжэйшага замежжа. З найбольш мастацка значных 48 сцэнічных твораў, яны складаюць 73%. Нацыянальная драматургія ў гэтым тэатры складае толькі 27%, а замежныя п’есы зусім не ставяцца.

Сярод лепшых спектакляў Пастаўскага тэатра: “Выбачайце, калі ласка!” А. Макаёнка (рэжысёр В. Галкін), “Кухарка” А. Сафронава, “Ленінградскі праспект” І. Штока, “Іголка і штык” Г. Аліева (рэжысёр В. Шмякаў), “Першы урок” К. Губарэвіча, “Нюрка-разбойніца” Л. Давідчава, “Цудоўны сплаў” У. Кіршона, “Несцерка” В. Вольскага (рэжысёр В. Стахоўскі), “Транзіт” Л. Зорына, “Верачка” А. Макаёнка (пастаноўшчык В. Жук). З тэатрам шмат гадоў супрацоўнічалі акцёры тэатра імя Я. Коласа Л. Кавалёў і С. Новак. Тэатр, як  і ўсе тэатры Заходняга Паазер’я, вёў багатую гастрольную дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Докшыцкім народным тэатры (1945 г.) наадварот, беларуская драматургія складае большую палову ад агульнай колькасці найбольш мастацкіх пастановак. На долю спектаклей, паводле твораў рускіх і савецкіх аўтараў выпадае 40,5%, 5,4% складае замежная драматургія. Асаблівасці творчай манеры тэатра з радзімы Патупчыка – у вернасці народным традыцыям, якія бяруць вытокі ў тэатральна-фальклорнай спадчыне. Менавіта ў народнай манеры былі пастаўлены спектаклі Я. Купалы "Прымакі", "Паўлінка"; А. Рылько "Ой, рана на Йвана", "Гром з яснага неба"; А. Макаёнка "Трыбунал" і інш. У мастацкую тканіну гэтых спектакляў лаканічна ўплятаюцца народная музыка, песня, танец. Ва ўмацаванні народных традыцый і пашырэнні папулярнасці калектыва вялікая заслуга рэжысёра народнага тэатра Г.В. Яцкоўскай.

Да паспяховых работ тэатра можна аднесці "Восем закаханых жанчын" Р. Тома, "Без віны вінаватыя" А. Астроўскага, "Рэвізор" М. Гогаля, "Партызаны", "Хто смяецца апошнім" К. Крапівы, "Як Несцерка па свеце гуляў" У. Бутрамеева, "Сабака з залатым зубам" У. Сауліча, "Чароўная башмачніца" Ф.-Г. Лоркі, "Брыльянт" Е. Пшэздзецкага. За актыўную прапаганду драматычных твораў Докшыцкі народны тэатр быў узнагароджаны дыпломам сакратарыята праўлення Саюза пісьменнікаў, а за прапаганду айчыннай (рускай) класікі атрымаў дыплом Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра СССР.

Самы малады тэатральны калектыў Заходняга Паазер'я – Міёрскі. Званне было прысуджана ў 1984 г., хоць драмгуртюк быў арганізаваны па ініцыятыве І.І. Каспяровіча яшчэ ў 1960-я гг. Першапаткова рэпертуар складалі толькі аднаактовыя творы, пазней ставіліся і шматактовая класічнай і сучаснай драматургія рускіх і айчынных аўтараў. Лепшыя старонкі біяграфію калектыва ўпісалі рэжысёры І. Каспяровіч, В. Варанько ("Гісторыя з метранпажам" А. Вампілава, "Хатынскі снег" па паэме Г. Бураўкіна, "Сусед з трыццаць чацвёртай" І. Лёвіна, "Сымон-музыка" паводле Я. Коласа); Э. Багдановіч ("Пайсці і не вярнуцца" В. Быкава, "Збянтэжаны Саука" Л. Родзевіча, "Ажаніцца не журыцца" М. Чарота і Далецкіх), І. Крот ("Дом на мяжы" С. Мрожака).

Такім чынам, можна адзначыць, што сёння аматарскія тэатры ў тканіне тэатральнага мастацтва па-ранейшаму застаюцца вельмі важнай складаючай часткай. Нягледзячы на ўсе перамены, якія адбываліся і адбываюцца ў нашым грамадстве, аматарскі тэатр не толькі не знікае, але і набывае новыя напрамакі творчай дзейнасці. Як ніколі актуальнай становяцца выхаваўчая і мастацка-эстэтычная функцыя аматарскага тэатра ў сучасным грамадстве.

Працяг даследаванняў асаблівасцей станаўлення і развіцця аматарскага тэатральнага мастацтва па этнаграфічных рэгіёнах Беларусі не толькі дазволіць нам скласці дастаткова аб'ектыўную карціну сучаснага становішча, але і дапаможа распрацаваць праграму далейшага развіцця тэатральных жанраў у нашай Рэспубліцы.

---

1. Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. / гал. рэд. У.І. Няфёд. – Мінск : Навука і тэхніка,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ